## Сацыяльная абароненасць «чарнобыльцаў».

Традыцыйна значная частка сродкаў, што выдаткоўваюцца на пераадоленне наступстваў аварыі на ЧАЭС, накіроўваецца на сацыяльную абарону пацярпелых людзей.

Сёлета на гэтыя патрэбы мяркуецца выдзеліць больш за 400 млрд рублёў. Пра гэта на сустрэчы з журналістамі паведаміў першы намеснік начальніка Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анатоль Загорскі. Як заўважыў спецыяліст, гэты кірунак застаецца сярод прыярытэтаў, паколькі галоўны крытэрый адпаведных мерапрыемстваў — змяншэнне дозы апраменьвання насельніцтва.

З 16 ліпеня ўступае ў дзеянне новы "чарнобыльскі" закон. Паводле слоў начальніка аддзела сацыяльнай абароны Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзіміра Кудзіна, дапамога людзям, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, застаецца па-ранейшаму на належным узроўні. Сярод галоўных момантаў — падтрымка найбольш неабароненых катэгорый, у прыватнасці, дзяцей і інвалідаў-чарнобыльцаў. Цяпер прычынную сувязь захворвання дзіцяці з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС будзе вызначаць толькі спецыяльна створаны экспертны савет. Паводле новага закона, пэўнымі льготамі будуць карыстацца людзі, якія пацярпелі ад іншых радыяцыйных аварый. Такіх у Беларусі налічваецца каля 3 тысяч чалавек. Адпаведная заканадаўчая норма ўводзіцца ўпершыню.

Як адзначыў Уладзімір Кудзін, скасаваныя льготы для тых, хто прыехаў на забруджаную тэрыторыю пасля 1990 года, а пасля адтуль з’ехаў.

***Мікалай ЛІТВІНАЎ.***

**Источник:** Звязда.-2009.-23 крас.-С.1.